## Список литературы

*Анохин О. В.* Фальшивомонетчество у варварских племён на территории современной Украины и Молдовы. Каталог варварских подражаний. Днепропетровск, 2015.

*Кропоткин В. В.* Клады римских монет на территории СССР. Москва, 1961.

*Магомедов Б. В.* Монети як джерело вивчення історії племен черняхівської культури // Археологія, 2006, № 4. С. 46–51.

*Мызгин К. В.* Римская власть и варварская знать: нумизматический аспект // Новые материалы и методы археологического исследования. Материалы II Международной конференции молодых учёных. Москва, 2013. С. 119–121.

*Мызгин К. В.* Подвески из римских монет в ареале черняховской культуры восточнее р. Прут // Лесная и лесостепная зоны Восточной Европы в эпохи римских влияний и Великого переселения народов. Конференция 2. В 2 ч.: Ч. 2. Тула, 2010. С. 87–108.

*Надвірняк О., Погорілець О., Надвірняк О.* Про деякі аспекти використання римської монети та її «наслідувань» у поховальному обряді племен черняхівської культури (за матеріалами межиріччя Середнього Подністер'я і Південного Побужжя) // Археологічні студії «Межибіж», 2015, Вип. 4. С. 86–96.

*Некрасова А. Н.* Памятники черняховской культуры Днепровского Левобережья // Готы и Рим. Киев, 2006. С. 87–200.

*Петречко О. М.* Релігійна політика Септимія Севера та культ імператора // Древности, Харьков, 2012. С. 54–60.

*Bemmann J.* Zur Münz- und Münzersatzbeigabe in Gräbern der Römischen Kaiserzeit und Völkerwanderungszeit des mittel- und nordeuropäischen Barbaricums // Neue Forschungsergebnisse zur nordwesteuröpäischen Frühgeschihte unter besonderer Berücksichtingung der altsächsischen Kultur im heutigen Niedersachsen. Oldenburg, 2005. S. 1–62.



**В. Г. Белявец, В. М. Сідаровіч**

*Мінск, Беларусь*


# РЫМСКІЯ МАНЕТЫ З СЕЛІШЧА МЕРЧЫЦЫ-2 ПІНСКАГА РАЁНА

У перыяд з 2011 да 2017 г. на шматслойным селішчы Мерчыцы-2, што размешчана на захад ад аднайменнай вёскі Пінскага раёна Брэсцкай вобласці, была атрымана невялікая (6 экз.), але цікавая падборка антычных манет. Тры з іх – дэнарыі Рымскай імперыі: манета Антаніна Пія чаканкі 148–149 гг. (RIC 176) і 2 манеты Марка Аўрэлія, адчаканеныя ў 174–

175 гг. (RIC ?, адзін дэнарый захаваўся часткова). Яшчэ адна манета з’яўляецца, верагодна, субэратным (плакіраваным) імперскім дэнарыям, срэбранае пакрыццё і выявы якога амаль знішчаны карозіяй.

Значна пазнейшай па даце эмісіі (і, магчыма, па часе пранікнення ў Пінскае Палессе) з’яўляецца невялікая медная манета Канстанцыя II, адчаканеная ў 351–355 гг. у Канстанцінопалі (RIC VIII, 115). У адрозненне ад дэнарыяў I–II стст., гэта надзвычай рэдкая як для Палесся, так і ўвогуле Беларусі знаходка.

Найбольш цікавай сярод манетных знаходак падаецца варварская імітацыя дэнарыя Рымскай імперыі. Аверс манеты капіруе дэнарый Адрыяна 134–138 гг. чаканкі. Легенда аверса, якая захавалася часткова, выканана з памылкай у імені імператара – *…ANVAS AVG COS III P P* (замест *HADRIANVS AVG COS III P P*). Выява рэверса імітуе, хутчэй за ўсё, багіню Весту, якая стаіць управа і трымае ў правай руцэ нешта падобнае на сімпулюм (чарпак для рэлігійных дзеянняў). У рэштках легенды ўгадваецца *COS III*. Манеты з падобным рэверсам невядомыя ў чаканцы Адрыяна, затое маюцца, напрыклад, у эмісіях Антаніна Пія.



Варварская імітацыя дэнарыя з селішча Мерчыцы-2 (павялічана)

Разведачныя працы на селішчы ў Мерчыцах (зборы, у тым ліку з выкарыстаннем металадэтэктара і шурфоўкі), праведзеныя В. Г. Беляўцом у 2012 і 2015 гг., дазволілі вызначыць, што помнік выкарыстоўваўся амаль бесперапынна на працягу ранняга жалезнага веку, перыяду рымскіх уплываў і эпохі Вялікага перасялення народаў. Знаходкі на ім антычных манет павінны звязвацца, перадусім, з гарызонтам вельбарскай культуры.